2. Півавар, К. С. Крытэрыі вылучэння ключавых канцэптаў пры мадэляванні нацыянальных канцэптасфер / К. С. Півавар // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2023. – № 4. – С. 105–107.
3. Рубцова, М. С. Канцэпт “шчасце” ў беларускай мове: паняційная база і вобразны змест // 75-я научн. конф. студентов и аспирантов Белорусского государственного университета [Электронный ресурс] : материалы конф. В 3 ч.: Ч. 3, Минск, 14-23 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т, Гл. упр. науки; редкол.: В. Г. Сафонов [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 101–104.
4. Рубцова, М. С. Афарыстычная інтразона канцэпту «шчасце» ў беларускай мове / М. С. Рубцова, А. Л. Садоўская // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання [Электронны рэсурс] : матэрыялы IV Рэсп. навук.-практ. канф. маладых вучоных, Мінск, 17 сак. 2017 г. / рэдкал.: П. І. Навойчык (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2017. – С. 165–169.
5. Шыманская В. Ю. Нацыянальна-культурная спецыфіка рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў беларускай мове: трансфармацыйны аспект / В. Ю. Шыманская. – Мінск : РІВШ, 2024. – 128 с.

## СУПАСТАЎЛЕННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ТВОРА “СЭРЦА НА ДАЛОНІ” З ЯГО ІНТЭРПРЭТАЦЫЯЙ У ТЭЛЕСПЕКТАКЛІ

**Ламнёва А. М.**

Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – *Качан А. С.*

Назва рамана І. Шамякіна “Сэрца на далоні” з’яўляецца своеасаблівай формулай глыбокага мастацкага сэнсу твора. Сэрца – гэта галоўны орган чалавека, дзякуючы яму жыве ўвесь арганізм. У творы ён сімвалізуе пачуцці герояў: іх страхі, сумненні, каханне.

Раман “Сэрца на далоні” расказвае нам пра жыццё хірурга-падпольшчыка Антона Яраша. У сваім творы аўтар хацеў паказаць не толькі ўзаемаадносіны паміж малодшым і старэйшым пакаленнем, але і перадаць сутнасць чалавечага характару. І. Шамякін быў тонкім філосафам і псіхолагам, пагэтаму сюжэт рамана праблематычны, востраканфліктны, напоўнены разважаннямі.

Пры пастаноўцы экранізацыі рамана “Сэрца на далоні” рэжысёр звярнуўся да самога Івана Шамякіна, каб атрымаць кансультацыю ў напісанні сцэнарыя. Але раман і тэлеспектакль – гэта ўсё ж такі розныя жанры. Для зручнасці супастаўлення намі была складзена наступная табліца 1.

Яраш Антон Кузьміч – таленавіты хірург, прамы, спакойны, які не баіцца ўзяць на сябе адказнасць за жыццё пацыентаў. Усваіх руках ён трымае сэрца сваей выратавальніцы ў вайну, пазбаўленай здароўя Зосі Савіч. Аўтар



Рэпазіторый ГрГМУ

невыпадкова даверыў прыгожаму чалавеку з дужымі і чыстымі рукамі сэрца сваёй гераіні, таму што толькі добрасумленныя прафесіяналы могуць вырашаць лёс іншых.

Табліца 1 – Параўнальная табліца
рамана “Сэрца на далоні” і тэлеспектакля

| Крытэрыі супастаўлення | Раман “Сэрца на далоні”, аўтар Іван Шамякін | Тэлеспектакль “Сэрца на далоні”, рэжысёр Віктар Карпілаў [2] |
|---|---|---|
| Назва | Супадае. Назва рамана “Сэрца на далоні” была першаснай. | Супадае. Атрымаў назву “Сэрца на далоні” па назве літаратурнага твора, на які была зроблена экранізацыя. |
| Год напісання / выдання / выпуску | Напісанне 1960-1963 г., друкаваўся у часопісе “Полымя”, асобнае выданне 1964. | 1964 г. |
| Працягласць | 9 гадзін 42 хвіліны 49 секунд (аўдыякніга). | 96 хвілін. |
| Сюжэт | Сюжэт падрабязны, шмат увагі нададзена дэталям, апісанне герояў, прыроды, падзей Вялікай Айчыннай вайны. | Ёсць несупадзенняў з сюжэтам кнігі. Асноўныя моманты былі паказаны, але многія дыялогі засталіся “за кадрам”. Амаль няма сцэн на прыродзе. |
| Тэматыка і праблематыка | Раман апавядае пра жыццё і лёс простых людзей у пасляваеннай Беларусі, закранае пытанні падполля ў час Вялікай Айчыннай вайны. Даследуюцца тэмы кахання, адданасці, сумленнасці і шчырасці, здрадніцва і подласці. Узнімаюцца праблемы сацыялістычнага грамадства, бацькоў і дзяцей. | Героі звычайныя людзі. На працягу ўсяго фільму жывуць сваім жыццём. Вырашаюць праблемы, любяць выхоўваюць дзяцей і нам паказваюць цалкам свае жыццяздольныя гісторыі. Да гэтага дадаюцца і рэўнасць звычайных людзей, і сумневы, і зайздрасць, і нават помста, і здрада Таксама не забыліся ў тэлеспектаклі раскрыць праблему непаразумення розных пакаленняў. |
| Вобразы герояў | Знешнасць герояў, як і іх характар, вельмі падрабязна апісаны ў кнізе, па гэтым у чытача не ўзнікне цяжкасці ў іх ўяўленні. Да гэтага трэба дадаць ролю прыроды ў раскрыцці вобразаў і пазіцыю самога аўтара ў раскрыцці вобразаў герояў. | Кожны герой – самастойны і важны персанаж. У тэлеспектаклі вельмі добра падабралі вобразы герояў, як галоўных так і другарадных. Вы зусім дакладна бачыце і яркую Машу, і сур’ёзнага Тараса, і сціплую Зосю, і станоўчага ва ўсіх сэнсах галоўнага героя Антона Яраша.<br>Тэлеспектакль чорна-белы, і мы не можам у поўным аб’ёме ўбачыць адпаведнасць знешнасці персанажаў, але іх унутраны свет супадае з кнігай поўнасцю. |



Рэпазіторый ГрГМУ

Працяг табліцы 1

| Крытэрыі супастаўлення | Раман “Сэрца на далоні”, аўтар Іван Шамякін | Тэлеспектакль “Сэрца на далоні”, рэжысёр Віктар Карпілаў [2] |
|---|---|---|
| Адзнака | LiverLib: 4,4/5.0<br>IRecommend: 5.0/5.0 | Адсутнічае. |
| Мова | Беларуская мова, ёсць пераклад на рускую мову. | Руская мова. |
| Рэкамендуем? | Кніга выдатная, рэкамендуем кожнаму яе прачытаць. Нягледзячы на тое, што раман напісаны ў мінулым стагоддзі, праблемы, якія ўздымаюцца ў ім да гэтага часу актуальны. | Тэлеспектакль не перанесены на лічбавыя носьбіты. Убачыць яго можна толькі па тэлебачанні. Пасля доўгага перапынку яго зноў сталі паказваць на БТ. Вельмі хочацца мець яго ў добрай якасці і ў агульным доступе. Але, зразумела, трэба спачатку пазнаёміцца з першакрыніцай (раманам). |

Пэўную ролю ў раскрыцці характару адыгрывае прырода. Яраш “умеў не толькі любавацца, але і стараўся ўспомніць ці выявіць законы яе з’яў” [1, с. 83].

У тэлеспектаклі Антон Яраш паказаны мужчынам сярэдніх гадоў, высокі, з валасамі каштанавага колеру, волатаўскага целаскладу, прыгожы, трохі наіўны і сентыментальны. На жаль, мы не бачым колер яго валасоў з-за чорна-белай стужкі, а ў кнізе аўтар нам якраз гэта дакладна апісвае. Па гэтай жа прычыне мы не можам у поўнай меры ўлавіць вобраз прыроды, якая ў рамане дапамагае раскрыццю характараў герояў.

У творы аўтарам вельмі падрабязна апісана сцэна аперацыі на адкрытым сэрцы. У момант перад аперацыяй Яраш паўстае ў белым адзенні, у белай шапачцы, якая “аж ззяла ў святле раніцы” [1, с. 247]. У тэлеспектаклі белага колеру вельмі шмат, ён аж слепіць вочы ад белых халатаў.

Мы ўпэненны, што і раман, і кінаспектакль не пакінуць раўнадушнымі ні чытача, ні гледача. Выбар за вамі!

Літаратура:

1. Шамякін, І.П. Непаўторная вясна : аповесць. Сэрца на далоні : раман / Іван Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2014. – 526 с.

2. Сердце на ладони. Пересматриваем экранизации Шамякина. – URL: https://belta.by/culture/view/serdtse-na-ladoni-peresmatrivaem-ekranizatsii-shamjakina-179523-2016/ (дата обращения: 14.11.2025).

Репозиторий ГрГМУ